Пад кантролем

ЧАС ЗБІРАЦЬ УРАДЖАЙ

Рабіць гэта своечасова і з мінімальнымі стратамі хлебаробам дапамагаюць супрацоўнікі органаў унутраных спраў

Уборачная кампанія пачалася сёлета раней, чым звычайна. Для сельгаспрадпрыемстваў, якія падрыхтаваліся да жніва, гэта не стала нечаканасцю: тэхніка ў тэрмін выехала ў поле, зернесушыльныя комплексы прымаюць збожжа, людзі мабілізаваны на сур'ёзную адказную работу. Уключыцца на поўную магутнасць у гэты гарачы час ім дапамагаюць супрацоўнікі ўнутраных спраў, якія своечасова ўказваюць на недахопы, кантралююць іх выпраўленне, выяўляюць і папярэджваюць правапарушэнні ў гэтай сферы. Для міліцыянераў перыяд жніва не менш адказны, чым для механізатараў. Як і хлебаробы, людзі ў пагонах днём і ноччу клапоцяцца аб тым, каб страт было як мага менш, а агульнанацыянальны каравай па выніках уборачнай кампаніі стаў не толькі важкім, а яшчэ і якасным.

Невыпадкова яшчэ да пачатку жніва міліцыянеры праінспектавалі ўсе прадпрыемствы аграпрамысловага комплексу краіны. Супрацоўнікі органаў унутраных спраў праверылі гатоўнасць тэхнікі да сезонных работ, ацанілі ўмовы, створаныя для сушкі і захоўвання збожжавых, зернебабовых і кармавых культур. Цяперашняя дзейнасць праваахоўнікаў у асноўным скіравана на папярэджанне правапарушэнняў у сферы АПК, выкананне працоўнай дысцыпліны. З гэтай мэтай праводзяцца рэгулярныя рэйдавыя мерапрыемствы. У адзін з такіх рэйдаў разам з супрацоўнікамі аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі ўпраўлення ўнутраных спраў Мінскага райвыканкама накіраваліся і карэспандэнты «Звязды».

Гарантыя хуткай уборкі

Згодна з планам, аб'ектам інспекцыі стала найбуйнейшае мерапрыемства Міншчыны — Мінскае раённае ўнітарнае прадпрыемства «Агракамбінат «Ждановічы». Агародніну, вырашчаную на гэтым прадпрыемстве, у асноўным ужываюць жыхары сталіцы. Таксама агракамбінат спецыялізуецца на вытворчасці, рэалізацыі прадукцыі жывёлагадоўлі і чмеляводства. Мінчане і не толькі з задавальненнем набываюць і кветкі, вырашчаныя на ждановіцкіх палетках.

Набірае тэмпы ўборачная кампанія, а таму найперш супрацоўнікаў органаў унутраных спраў хвалюе тое, каб не прастойвала тэхніка: чым лепш сельскагаспадарчае прадпрыемства падрыхтуецца да жніва, тым хутчэй будзе сабраны ўраджай. Невыпадкова рэйдавая група накіроўваецца ў машынна-трактарны парк. Тэхнікі, прычым самай рознай, тут даволі шмат. Перад пачаткам уборачнай кампаніі кожная адзінка была праверана супрацоўнікамі міліцыі на прадмет гатоўнасці. Аднак каля некаторых машын шчыруюць механізатары — ліквідуюць няспраўнасці. Як высвятляецца, рамонт бягучы. Некалькі штрыхоў — і машыны зноў выедуць у поле.

«Калі скончыце рамонт?» — цікавіцца ў механізатараў **намеснік начальніка аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі ўпраўлення ўнутраных спраў Мінскага райвыканкама падпалкоўнік міліцыі Вячаслаў ПАРГАНАЕЎ.**

Работнікі прадпрыемства завяраюць: і камбайны, і бартавыя машыны задзейнічаны ў жніве. Што датычыцца тэхнікі, якая знаходзіцца ў машынна-трактарным парку, то яна не прастойвае. Уборачная кампанія яшчэ не ўвайшла ў гарачую фазу, а таму адпраўляць усе машыны на палеткі пакуль няма сэнсу. Вось і выкарыстоўваюць механізатары вольную хвіліну, каб прывесці сваіх «жалезных коней» у поўны парадак.

«Час дазваляе ліквідаваць дробныя недахопы, каб потым падчас масавай уборкі ўраджаю не было непрадбачаных прастояў, — кажа **намеснік галоўнага інжынера службы механізацыі агракамбіната «Ждановічы» Аляксандр БАРАН.** — Такой тэхнікі, якая ўвогуле не выйдзе ў поле, у нас няма. Камбайны і машыны стапрацэнтна гатовы да выезду. Усе збожжаўборачныя камбайны да 1 ліпеня прайшлі дзяржаўны тэхнічны агляд і дапушчаны да ўборкі збожжавых культур. Чакаем паспявання хлеба».

Камбайнеры, якія пакуль не задзейнічаны на жніве, прыбіраюць травы — паспеў трэці ўкос.

«Травы прыбіраеце па тэхналогіі?» — удакладняе супрацоўнік органаў унутраных спраў.

«А як жа! — адказвае намеснік галоўнага інжынера. — Пакуль закладваем у траншэі. Пойдзе актыўна ўборка, будзем круціць у поліэтылен».

На сельгаспрадпрыемстве прызвычаіліся да ўвагі з боку кантралюючых органаў. І гэта, па словах намесніка галоўнага інжынера, толькі на карысць: недахопы, якія не ўбачаць самі, ім дапамогуць выявіць. Адпаведна, выяўленыя парушэнні аператыўна выпраўляюцца. Акрамя таго, як звяртае ўвагу Аляксандр Баран, рэгулярная прысутнасць супрацоўнікаў міліцыі на агракамбінаце ўплывае на працоўную дысцыпліну. «Работнікі пастаянна бачаць людзей у форме, гэта іх дысцыплінуе», — тлумачыць ён.

Кожны літр паліва — на ўліку

Накіроўваемся на заправачную станцыю: яна знаходзіцца на тэрыторыі машынна-трактарнага парка. На маршруце — адгароджаныя плотам пляцоўкі, на якіх, мяркуючы па ўсім, захоўваецца не прыдатная для эксплуатацыі тэхніка. Намеснік начальніка аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі ўпраўлення ўнутраных спраў Мінскага райвыканкама ўдакладняе: «Што за плотам?»

Як высвятляецца, першая пляцоўка выкарыстоўваецца для разборкі спісанай тэхнікі. На другой пляцоўцы захоўваецца металалом для наступнай яго здачы. На трэцяй складзіруюцца шыны, якія ўжо знаходзіліся ў выкарыстанні. Супрацоўнікі міліцыі заўважаюць, што ўсё на сваіх месцах, нічога пад плотам не стаіць, не валяецца — адным словам, гаспадарскі падыход.

На заправачнай станцыі **оперупаўнаважаны аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі ўпраўлення ўнутраных спраў Мінскага райвыканкама лейтэнант міліцыі Уладзіслаў КОНАН** запрасіў дакументацыю па сённяшняй запраўцы аўтатранспартных сродкаў. Вывучыўшы запісы, супрацоўнік міліцыі са спецыяльнай лінейкай замераў узровень паліва ў ёмістасцях, дзе яно захоўваецца, — супадае.

«Бываюць невялікія разыходжанні: хібнасць могуць даваць тыя ж прыборы вымярэння, — тлумачыць лейтэнант міліцыі. — Напрыклад, заправіцца сто трактароў, і з улікам хібнасці недахоп паліва будзе складаць 10-15 літраў. Сам дыспетчар таксама можа дапусціць памылку пры ўнясенні даных. Гэта мы ўсё пераправерым. Несанкцыянаваны ж зліў паліва ўтаіць нерэальна».

У гэтым плане жорсткі кантроль над механізатарамі ажыццяўляецца і з боку сельгаспрадпрыемства. «Практычна ўсе камбайны і трактары абсталяваны датчыкамі расходу паліва, — тлумачыць Аляксандр Баран. — У любы час у сваім тэлефоне я магу ўбачыць, дзе хто працуе і што адбываецца з палівам. Калі на канкрэтнай машыне расход пачынае павялічвацца, гэта азначае або зліў паліва, або паломку паліўнай сістэмы. Адразу да тэхнікі выязджае спецыяльная камісія, якая высвятляе прычыну».

Пад надзейнай аховай

На палетках, куды далей накіравалася рэйдавая група, міліцыянеры вырашылі праверыць, як ажыццяўляецца ўборка. Скончыць працу на полі з азімым ячменем механізатарам не дазволіла надвор'е — ноччу быў дождж. Аднак камбайны ўсё роўна выехалі ў поле. Не жнуць, чакаюць, калі ўсё падсохне і можна будзе завесці маторы, каб сабраць збожжа з найменшымі стратамі.

Карыстаючыся магчымасцю рэдкага зацішша, гутарым з загадчыкам майстэрні і вядучым інжынерам-механікам прадпрыемства, якія ў час жніва сталі хлебаробамі і працуюць на камбайнах. Сяргей Дубень і Яўген Кавалеўскі прызнаюцца, што работа ў полі ім вельмі падабаецца. «Разумеем, што робім вялікую справу: з нашай мукі пякуць хлеб, а значыць, мы кормім краіну», — кажуць маладыя людзі.

Вячаслаў Парганаеў расказвае, што кантрольныя мерапрыемствы па вывучэнні гатоўнасці сельскагаспадарчай тэхнікі да ўборачнай кампаніі заканчваюцца. Цяпер, па яго словах, асноўныя сілы будуць накіраваны на прафілактыку і выяўленне правапарушэнняў, звязаных з крадзяжом — ураджаю, паліва, запчастак, іншых матэрыяльных каштоўнасцяў. «Такія прафілактычныя мерапрыемствы ўплываюць на агульную дысцыпліну, — заўважае намеснік начальніка аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі ўпраўлення ўнутраных спраў Мінскага райвыканкама. — Усе ведаюць, што міліцыя актыўна працуе, а таму зламыснікі некалькі разоў падумаюць, ісці ім на парушэнне заканадаўства ці не».

Рэйдавыя групы працуюць як па ўзгадненні з кіраўніцтвам прадпрыемства, так і без папярэджання. «Не скажу, што гэта носіць сістэмны характар, але факты крадзяжу фіксуюцца, — адзначае Вячаслаў Парганаеў. — Як правіла, да крадзяжу паліва маюць дачыненне самі механізатары. Сёлета мы ўжо выявілі два такія факты. У цяперашні час у адносінах да зламыснікаў вядзецца адміністрацыйны працэс. Што датычыцца крадзяжу ўраджаю з сельскагаспадарчых аб'ектаў, то тут, як паказвае практыка, нярэдка задзейнічаны людзі, якія не працуюць на прадпрыемстве. Невыпадкова супрацоўнікі нашых рэйдавых груп вывучаюць умовы захоўвання таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў: звяртаюць увагу на тое, каб усё было зачынена, максімальна забяспечана аховай і сістэмамі відэаназірання».

Па словах падпалкоўніка міліцыі, кіраўнікі сельгаспрадпрыемстваў зацікаўлены ў сумеснай рабоце з супрацоўнікамі міліцыі, усяляк аказваюць садзейнічанне. Усе разумеюць, што робяць адну, вельмі важную, справу — забяспечваюць харчовую бяспеку краіны.

Вераніка КАНЮТА.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.
Мінскі раён.

Тонкасці прафесіі

Найлепшы адпачынак — бяспечны!

У гэтым упэўнены ўчастковы інспектар па справах непаўналетніх Дзмітрый КЕДА

Дзеці — кветкі жыцця, і гэта сапраўды так. Але, на жаль, сталі нярэдкімі выпадкі, калі «самы лепшы ў свеце сын» або «памочніца-дачка» становяцца на крывую дарожку: здзяйсняюць адміністрацыйныя і нават крымінальныя правапарушэнні, у выніку чаго з імі праводзіцца індывідуальная прафілактычная работа. Тут шмат што залежыць ад іх бацькоў, законных прадстаўнікоў. Пра тое, якія злачынствы здзяйсняюцца непаўналетнімі часцей за ўсё, як зберагчы дзяцей ад небяспекі падчас летніх канікул і многае іншае карэспандэнтам «Звязды» распавёў участковы інспектар УУС адміністрацыі Першамайскага раёна горада Мінска Дзмітрый Кеда, які па выніках Рэспубліканскага агляду-конкурсу стаў найлепшым інспектарам па справах непаўналетніх краіны.

Пра шлях да прафесіі і конкурсныя выпрабаванні

Для капітана міліцыі чужых дзяцей не бывае. За кожнага свайго падапечнага ён трывожыцца, перажывае, стараецца зрабіць усё, каб засцерагчы ад няправільных крокаў і неабдуманых учынкаў, расплата за якія часам занадта вялікая. У шчырай гутарцы Дзмітрый Кеда падзяліўся сваім бачаннем, як падабраць ключыкі да цяжкага ўзросту.

— Дзмітрый Віктаравіч, звязаць сваё жыццё з аховай правапарадку — годнае і адказнае рашэнне. Раскажыце, як прыйшлі ў прафесію, з чаго ўсё пачыналася?

— Звязаць свой прафесійны шлях з дзецьмі хацеў даўно. У 2011 годзе скончыў Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт Я. Купалы па спецыяльнасці «Алігафрэнапедагог. Лагапед-настаўнік». Пасля заканчэння ўніверсітэта два гады адпрацаваў у школе. Потым вырашыў паспрабаваць сябе ў іншай сферы — у міліцыі, дзе працую са снежня 2013 года. Падчас вучобы ў ГрДУ паступіў на ваенную кафедру, прайшоў поўны курс ваеннай падрыхтоўкі па праграме афіцэраў запасу. Калі трапіў ва УУС, мяне, у адрозненне ад іншых пачаткоўцаў, не адправілі ў навучальны цэнтр. Я адразу атрымаў званне лейтэнанта міліцыі і прыступіў да службы. Сёння асноўная мая задача — прафілактыка правапарушэнняў сярод непаўналетніх.

Але, акрамя дзяцей, даводзіцца працаваць і з іх бацькамі, законнымі прадстаўнікамі.

— У чэрвені гэтага года праходзіў рэспубліканскі агляд-конкурс на званне «Найлепшы ўчастковы інспектар інспекцыі па справах непаўналетніх», па выніках якога вы занялі ганаровае першае месца. Раскажыце, як гэта было, што з сябе ўяўляе конкурс?

— Конкурс на званне «Найлепшы ўчастковы інспектар ІСН» праводзіцца штогод. Ён праходзіць у тры этапы: першы — на базе РУУС, дзе выбіраюць найлепшых супрацоўнікаў, затым — абласны або, як у маім выпадку, гарадскі этап. Найлепшыя з лепшых трапляюць на рэспубліканскі этап, які ўключае ў сябе розныя выпрабаванні: страявую, агнявую і медыцынскую падрыхтоўку, аратарскае майстэрства, фізічную, баявую і спецыяльную падрыхтоўку. На трэці дзень — практыка. Кожны супрацоўнік выцягваў білет, на якім была апісана пэўная сітуацыя. Мне трапіў цікавы выпадак: заходжу ў прадуктовую краму і стаю ў чарзе. Перада мной — двое мужчын сярэдняга ўзросту, за мной — жанчына, якая спяшаецца, распаляе абстаноўку і падганяе касіра, на касе — малады чалавек, якому менавіта ў гэты дзень толькі споўнілася 18 гадоў, ён купляе віно. Касір прадае яму алкагольную прадукцыю, аднак па заканадаўстве ў дзень 18-годдзя рабіць гэта забаронена (прадаваць прадукцыю 18+ можна толькі на наступны дзень). У выніку ў нас атрымалася, што непаўналетняму прадалі алкагольную прадукцыю. Неабходна было даць прававую ацэнку сітуацыі, устанавіць, якія былі парушаныя нарматыўныя акты і гэтак далей. Апошнім выпрабаваннем стаў службовы трыятлон. У кожнай камандзе — па шэсць чалавек, з іх трое інспектараў ІСН і столькі ж участковых інспектараў міліцыі. У нас было некалькі забегаў. Па выніках усіх конкурсаў мяне выбралі пераможцам. Уручылі дыплом, вымпел, два сертыфікаты: адзін — на атрыманне службовага аўтамабіля, другі — на камп'ютарную тэхніку. Таксама буду атрымліваць надбаўку да заробку.

Недзіцячыя забавы

— Якія правапарушэнні сярод непаўналетніх сустракаюцца найбольш часта і чаму так адбываецца?

— Біч сучаснай моладзі — выкарыстанне электронных сістэм курэння. За гэта парушэнне прадугледжана адміністрацыйная адказнасць, згодна з артыкулам 19.9 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях. Нагадаю, што адміністрацыйная адказнасць надыходзіць па дасягненні асобы ўзросту 16 гадоў. Аднак у многіх выпадках дзецям, якія выкарыстоўваюць электронныя сістэмы курэння, яшчэ няма 16. У такім разе ажыццяўляецца праверка ў дачыненні да бацькоў і законных прадстаўнікоў. Таксама сярод школьнікаў часта сустракаюцца такія правапарушэнні, як ужыванне алкагольных, слабаалкагольных напояў і піва, дробнае хуліганства, дробны крадзеж. З крымінальных — крадзяжы, хуліганства і махлярства. На жаль, часта непаўналетнія становяцца кур'ерамі тэлефонных махляроў. Прычыны таго, што дзеці парушаюць закон, заўсёды розныя, кожны выпадак індывідуальны. Дзесьці недагледзелі бацькі. Бываюць жа вельмі добрыя сем'і, а дзіця проста трапляе ў дрэнную кампанію, хоча вылучыцца сярод іншых. Тыя ж дробныя крадзяжы часцяком адбываюцца ў заклад: «А ты можаш скрасці ў краме «Чупа-чупс»?» Ён і не патрэбны ім зусім, проста дзіця хоча адрэналіну, паказаць сябрам, якое яно «крутое».

— Існуе стэрэатып, што работа з непаўналетнімі больш жаночая...

— Так, сапраўды, апошнім часам склалася такая тэндэнцыя, што менавіта ў інспекцыю па справах непаўналетніх прыходзіць больш прадстаўніц прыгожага полу. На тым жа рэспубліканскім агляд-конкурсе з 21 удзельніка — дванаццаць жанчын. З кожным годам расце колькасць дзяўчат, якія ідуць у інспекцыю па справах непаўналетніх, што не можа не радаваць.

— Якія выпадкі з практыкі вам запомніліся больш за ўсё? Ці працуеце з непаўналетнімі, якія прыехалі да нас з іншых краін?

— У гэтым годзе быў выпадак, калі непаўналетні з Расійскай Федэрацыі прыехаў у нашу краіну для таго, каб афармпіць банкаўскую карту. У 16-гадовага хлопца гэта паспяхова атрымалася. Відаць, пасля гэтага ён вырашыў «абмыць» новую карту. Да нас яго даставілі ў стане алкагольнага ап'янення. Хлопец быў настолькі п'яны, што давялося выклікаць хуткую дапамогу. Яго адправілі ва ўстанову аховы здароўя. Мы вынеслі юнаму расіяніну папярэджанне, пасля чаго ён вярнуўся ў сваю краіну. Памятаю выпадак з непаўналетнім з пасёлка Плешчаніцы Лагойскага раёна. З хлопцам праводзілася індывідуальная прафілактычная работа. Да таго, як нам перадалі кантрольную карту, ён паспеў пабываць у выхаваўчай калоніі і ў вучэбна-выхаваўчай установе. Злоўжываў алкаголем, здзяйсняў крадзяжы маёмасці. Тэлебачанне нават брала ў яго інтэрв'ю, у якім абяцаў стаць на шлях выпраўлення, перастаць піць. А шостай гадзіне я пайшоў дадому, праз тры гадзіны паступіла скарга на п'яных суседзяў. Туды прыехаў участковы інспектар, як высветлілася — уся сям'я таго хлопца п'яная, а ён — больш за ўсіх. Непаўналетні стаў аказваць супраціўленне супрацоўніку міліцыі, укусіў участковага за палец. Пазней хлопца забралі ў рэанімацыю. У далейшым ён зноў адправіўся ў месцы пазбаўлення волі.

— Летнія канікулы — небяспечная пара. Калі ў іншы час дзеці знаходзяцца ў школе, то летам застаюцца практычна без нагляду. Ці можна сказаць, што менавіта на канікулах назіраецца найбольшы пік правапарушэнняў ці ўсё індывідуальна?

— Лета — актыўная пара для школьнікаў. Падчас канікул ёсць магчымасць уволю накупацца, даўжэй гуляць на вуліцы з сябрамі, асвоіць новае хобі ці наведаць дзіцячы лагер. Але багацце вольнага часу можа згуляць злы жарт з тымі, хто не выконвае правілы бяспекі. Вядома, што гульні на вуліцы — неад'емная частка баўлення вольнага часу для актыўных дзяцей. Аднак з-за ўзросту хлопцы і дзяўчаты часта не заўважаюць небяспекі, якія могуць нашкодзіць ім і нават у некаторых выпадках каштаваць ім жыцця. Так, напрыклад, на мінулым тыдні дзеці гулялі ў «даганялкі», адзін хлопчык, спрабуючы ўцячы ад аднагодкаў, залез на дах гаража. Каб кантраляваць набліжэнне астатніх дзяцей, якія рушылі ўслед за ім, хлопчык ішоў задам і не заўважыў, як дах скончыўся. Школьнік зваліўся з вышыні, атрымаў траўмы рознай ступені цяжкасці і быў дастаўлены ў бальніцу. Каб пазбегнуць падобных выпадкаў, з дзецьмі неабходна праводзіць гутаркі і нагадваць пра тое, што нельга гуляць на будаўнічых пляцоўках, у закінутых будынках, паблізу чыгуначных пуцей і праезнай часткі; залазіць на дахі будынкаў і гаражоў, самастойна разводзіць вогнішчы і купацца ў адзіночку; садзіцца ў машыны да незнаёмцаў, хадзіць да іх у госці і прымаць ад такіх людзей падарункі; запрашаць дадому незнаёмых людзей, калі дома няма нікога з дарослых; парушаць правілы дарожнага руху пры руху ў пешым парадку, на веласіпедах і самакатах. Нямала правапарушэнняў сярод непаўналетніх фіксуецца і ў верасні, калі ў горад прыязджаюць непаўналетнія студэнты, а дзеці вяртаюцца з вёсак ад сваіх бабуль і дзядуляў. Мая галоўная парада бацькам — кантраляваць дзяцей, удзяляць ім увагу, часцей тэлефаноўвацца з імі і імкнуцца больш часу праводзіць разам. Думаю, што, калі бацькі будуць больш увагі аддаваць свайму дзіцяці, у яго будзе менш часу ўчыніць нешта супрацьпраўнае.

Папярэджаны — значыць узброены

З 1 мая да 1 кастрычніка ў краіне праходзіць рэспубліканская міжведамасная праграма «Клопат». Яе мэта — арганізацыя занятасці, вольнага часу і аздараўлення дзяцей у летні перыяд, прыняцце дадатковых мер па павышэнні ўзроўню іх бяспекі. Супрацоўнікі інспекцыі па справах непаўналетніх на пастаяннай аснове праводзяць прафілактычныя мерапрыемствы з дзецьмі са школьных лагераў, арганізоўваюць экскурсіі ў музеі.

Разам з участковым інспектарам па справах непаўналетніх мы пабывалі ў Цэнтры дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Арт», дзе Дзмітрый Кеда акцэнтаваў увагу на ўжыванні, захоўванні і распаўсюджанні наркатычных сродкаў, выкарыстанні электронных сістэм курэння, ужыванні слабаалкагольных, алкагольных напояў і піва. Міліцыянер распавёў пра наступствы крадзяжоў, хуліганства, нанясенні цялесных пашкоджанняў, прывёў нядаўнія прыклады адміністрацыйных і крымінальных правапарушэнняў, учыненых падлеткамі, і адзначыў, што ні ў якім выпадку нельга станавіцца кур'ерам інтэрнэт-махляроў.

У чарговы раз дзеці перакананыя: лёгкіх грошай не бывае. «Гутарка з міліцыянерам была карыснай і цікавай, — распавёў выхаванец цэнтра Вячаслаў Ізотаў. — Падчас яе я даведаўся шмат новага. Сам інспектар вельмі даступна і проста тлумачыў нам аб асноўных правапарушэннях сярод дзяцей». Па словах вучаніцы гімназіі № 38 горада Мінска Таццяны Скуратовіч, у яе выразна адкладаліся ў памяці правілы перамяшчэння на электрасамакатах і іншых сродках індывідуальнай мабільнасці. А вучаніца сярэдняй школы № 197 г. Мінска імя Герояў 120-й дывізіі Марына Самошкіна даведалася шмат новага пра крымінальныя злачынствы, якія могуць здзяйсняцца падлеткамі, і пакаранні за іх. «Дзякуючы інспектару ў чарговы раз перакаталася: ні за што не пайду па крывой дарозе», — дапоўніла яна.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.